Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Навукова-метадычная ўстанова
**“Нацыянальны інстытут адукацыі”**
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск
тэл. (017) 200-59-09, тэл./факс 200-56-35
E-mail:info@adu.by

Министерство образования
Республики Беларусь

Научно-методическое учреждение
**“Национальный институт образования”**
Министерства образования Республики Беларусь

ул. Короля, 16, 220004, г. Минск
тел. (017) 200-59-09, тел./факс 200-56-35
E-mail:info@adu.by

23.09.2021 № 01-07/25-5
На №_____________ ад_______________

У Нацыянальным інстытуце адукацыі па даручэнні Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны Ваш зварот. Накіроўваем адказ на яго.

Дадатак: 1 л. у 1 экз.

Дырэктар інстытута В.В. Гінчук

Катовіч 3608809

У Нацыянальным інстытуце адукацыі па даручэнні Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны Ваш зварот. Па сутнасці зварота паведамляем наступнае.

У Год народнага адзінства прыярытэтнымі напрамкамі ў рабоце ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляюцца ідэалагічнае, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, якія прадугледжваюць фарміраванне ў вучняў маральных перакананняў, актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі.

Факультатыўныя заняткі ва ўстановах адукацыі арганізуюцца дадаткова з мэтай павышэння ў навучэнцаў цікавасці да вучэбных прадметаў, паглыблення іх зместу, актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, інтэлектуальнага, духоўнага і фізічнага развіцця, падрыхтоўкі да самастойнага жыццёвага выбару, пачатку працоўнай дзейнасці і працягу адукацыі (арт.158 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі).

Кожная ўстанова адукацыі самастойна плануе арганізацыю і правядзенне факультатыўных заняткаў на падставе вывучэння патрэб і запытаў усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу.

Катовіч 360 88 09